*Энгельс Дарашэвіч*

**МЕТАФІЗІКА, АЎТЭНТЫЧНАСЦЬ І АЎТАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ, ФАЛЬКЛОР** ***(змены ў зыходнай і актуальнай карэляцыі паміж паняццямі)***

*У гэтым артыкуле зроблена спроба прасачыць змены ў зыходнай і актуальнай карэляцыі паміж такімі паняццямі, як метафізіка, аўтэнтычнасць і аўтаідэнтыфікацыя, фальклор і нематэрыяльная культурная спадчына чалавецтва ў лагічным і анталагічным сэнсах.*

*Engels Darashevich*

**METAPHYSICS, AUTHENTICITY AND AUTOIDENTIFICATION, FOLKLORE** ***(changes in the initial and actual correlation between concepts)***

*This article is an attempt to trace the changes in the original and actual correlation between the such notions as metaphysics, the authenticity and the autoidentification, folklore and intangible cultural heritage of humanity in a logical and an ontological sense.*

Метафізіка – паняцце вельмі блізкае да паняцця філасофіі, але паміж імі ёсць прынцыповыя адрозненні, паколькі прапанаваная Арыстоцелем метафізіка Антычнасці (ст. грэч.τὰμετὰτὰφυσικά – «тое, што пасля фізікі») ставіць канцэптуальныя і глабальныя пытанні пра сутнасць быцця, паходжанне Сусвету, яго звышразумелы пачатак і сэнс і г.д.; а скіравана яна – перадусім на рэфлексію таго, што знаходзіцца па-за межамі фізічнай рэчаіснасці. У адрозненне ад метафізікі, філасофія (ст. грэч. φιλοσοφία – «любоў да ведаў»), паводле гісторыі навукі, ад Антычнасці да актуальнага часу, ніколі не ігнаруе фізічную рэчаіснасць; больш таго, ачаляе эксперыментальную навуку, якая гэтую рэчаіснасць прэпаруе і аналізуе, вывучае і мадэліруе.

Калі аналізаваць існасць метафізікі ў наш час, трэба ўлічваць прынцыповыя змены ў магчымасцях сучаснай цывілізацыі і ў жыцці сучасных людзей, ад якіх (праз імклівы неўтаймаваны тэхналагічны прагрэс) сёння залежыць лёс Сусвету, вырашэнне якога ў класічнай метафізіцы – прэрагатыва звышразумелага пачатку ўсяго існага. Імаверна, у наш час адбыліся такія значныя змены ў соцыуме і тэхналогіях, што гэта непазбежна і недвухсэнсоўна патрабуе змен у разуменні актуальнай метафізікі Сусвету. Менавіта сучасны соцыум дайшоўда такой мяжы ў тэхналогіях і свядомасці, што можа сам сябе вынішчыць, прычым, разам з асяродкам свайго існавання – планетай Зямля. Пасля двух стагоддзяў развіцця пад гуманістычным і прыгожым лозунгам «Liberté, Égalité, Fraternité» («Воля, Роўнасць, Братэрства») у Свеце нечакана актуальнай стала перспектыва эсхаталагічнага сутыкнення звышдзяржаў у ваенным канфлікце, і пры гэтым няважна, што яны дэкларуюць – больш важна, што яны робяць... Маўклівая большасць у рэгіёнах-полюсах сучаснага Свету ў асноўным ці звыклася з такім становішчам («А што мы можам?» – еўразійска-рускі варыянт), ці карнавальна мітынгуе і потым разыходзіцца (еўра-амерыканскі варыянт). Улічваючы вопыт дзвюх сусветных войнаў, і першыя, і апошнія – дзейнічаюць, як самагубцы… Анталагічнае пытанне сучаснасці, актуальны «question of time» рэчаіснасці: «Ці магчыма спыніць калектыўнае памкненне чалавецтва да самазабойства, альбо – усё ў Сусвеце нязменна фатальна?» – не вырашана. Зразумела адно: у XXI стагоддзі востра адчуваецца патрэба ў новай метафізіцы, новай палітыцы, новай духоўнасці і аўтаідэнтыфікацыі, новай маралі і новым іх узаемадзеянні.

Невялічкі прыклад – адным з асноўных пытанняў старой метафізікі з’яўляецца пытанне пра першаснасць Духу ці Прыроды (звышразумелага духоўнага пачатку ўсяго існага – Бога, ці Онтаса – усяго існага), зараз гэта пытанне адыходзіць на другі план, больш галоўнае і актуальнае – пытанне адзінства чалавечага і анталогіі. Коратка працягнем прыклады. «Ці ёсць прататып Бога ў нашым Онтасе?» [3]. Пад пагрозай ядзернага апакаліпсісу гэта пытанне зараз перафармулюецца такім чынам: «Ці магчыма зараз у прынцыпе захаваць наш Онтас, незалежна ад Боскага ці прыроднага Абсалюта, проста як Онтас у нашым разуменні і рэчаіснасці, ці ён непазбежна ператворыцца ў нішто для нас (асобы, чалавецтва і г.д.)?» Імаверная сусветная катастрофа здольная выклікаць сітуацыю, калі старая спрэчка сама сабою знікне, а Сусвету ад Зямлі і чалавецтва застанецца Нішто, прычым, нават больш глабальнае Нішто, чым Нішто ў квадраце Казіміра Малевіча…

Такім чынам, развіццё тэхналогій, асабліва атамнай энергіі ў XXI ст. вядзе да змены ў зыходнай і актуальнай карэляцыі паміж многімі асноўнымі паняццямі метафізікі, да таго, што сутнасць і сэнс метафізікі (і яе рэфлексіі) перасоўваюцца з сузіральнай сферы ў Праксіс. Але – не ў гегелеўскім ці марксісцкім сэнсе, а хутчэй у духоўна-творчым сэнсе, што аб’ядноўвае энергетыку інтэлектуальнай волі з верай у магчымасці чалавека (мысляра і стваральніка), і гэта – толькі першыя крокі па новым шляху, які чакае чалавецтва, калі яно жадае самазахавацца праз змену светапогляду. Далей – аб’яднанне ўсіх духоўных сэнсаў – рэлігійных, маральных, нацыянальна-этнічных, эстэтычных, навукова-тэарэтычных і г.д. на платформе новай метафізікі. Разам з тым, пры дакладна вывераным падыходзе гэта не павінна ператварыцца (а, магчыма, проста і не здольна ператварыцца) у новы віток глабалізацыі.

Падаецца, яднанню чалавецтва на светасузіральнай платформе новай метафізікі ў XXI ст. у першую чаргу павінна і здольна спрыяць сусветнае павуцінне – інтэрнэт. Ён не падпарадкоўваецца (ці не павінен падпарадкоўвацца) рэгіянальным інтарэсам, у пэўнай ступені незалежны ад лакальных адміністрацый і прыярытэтаўў іх актыўнасці. На яго «ростанях» і ў «прыцемках» мы маем шмат прыкладаў прынцыпова новага ўзаемадзеяння простых людзей Сусвету ў напрамку паляпшэння рэчаіснасці. Але ці варта сёння гуманітарыям адразу ствараць сайты «за новую метафізіку», «за новы светапогляд» і г.д.? Магчыма, спачатку варта проста абменьвацца інфармацыяй любога ўзроўню па глабальных пытаннях, якія тычацца патэнцыяльна небяспечных для Сусвету рэчаў (як гэта спрабавалі рабіць, напрыклад, WikiLeaks). Спачатку – варта абмяркоўваць новую метафізіку, а ўжо потым – хутчэй да практыкі.

Захоўваючы дасягненні цывілізацыі, новая метафізіка арыентуецца на дваякі працэс: у постіндустрыяльных грамадствах – на рух, што стартаваў і паскараецца да прыроднага і экалагічнага (з захаваннем экалогіі і этнічнай аўтэнтыкі), а ў краінах трэцяга свету – да разумнага руху індустрыяльных тэхналогій (з улікам асаблівасцей гэтых краін) да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйных. Трэба ашчадна распрацаваць праграмы захавання аўтэнтычных традыцый розных этнасаў (іх жытлаў, вытворчасці, сімволікі ўпісання ў ландшафт), злучаючы гэта з дасягненнямі постіндустрыяльнага грамадства. Самае галоўнае і першае – змяніць парадыгму «Sivis pacem parabellum», паколькі зараз следаванне такой парадыгме – абгрунтаванне самагубства. Трэба адмовіцца ад замкнутага і штучна навязанага стэрэатыпу мыслення «толькі зброя – выратаванне», бо гэта – шлях у сусветны морг.

Усё выкладзенае вышэй – гэта ўзровень метафізічны, тэарэтычны, гэта – тэарэтызаванне. Мы застаёмся ў гэтай сферы, пакуль метафізіруем (калі тут да месца гэты неалагізм). Але далей (у святле зменаў у сучасным Сусвеце) нам наканаваны імклівы шлях ад тэорыі да практыкі. Справа ў тым, што многія ідэі новай метафізікі фактычна выкарыстоўваюцца міжнароднай супольнасцю XXI ст. у якасці нарматыўна-прававых рэкамендацый і рэгулятараў, калі шэрагу элементаў традыцыйнай культуры розных народаў ЮНЕСКА прысвойвае статус «oral and intangible heritage of humanity» (літаральна «вуснай і нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва») [4, с. 11]. Фактычна статус спадчыны прысвойваецца таму, што знаходзіцца па-за межамі фізічнай рэчаіснасці і матэрыялізуецца толькі пры пэўных умовах, у аўтэнтычных фальклорных праявах, якія з’яўляюцца аўтаідэнтыфікацыйнымі для народаў, з’яўляюцца сімваламі іх самаідэнтыфікацыі. І гэты юрыдычны і прававы статус традыцый і звычаяў сведчыць аб прызнанні бясспрэчнай каштоўнасці метафізічнага аб’екта для чалавецтва XXI ст.

Працягваем прыклады. Што можа выправіць новая метафізіка ў Сусвеце? Ды амаль любую праблему. Пагодзімся, што ў сённяшнім Свеце найбольш актуальныя рэлігійныя разыходжанні і канфлікты. Вось тут наша метафізіка дазваляе перайсці ад спрэчак да пагаднення. Гэта значыць – да экуменізму, паколькі зярняты адвечных ісцін, бясспрэчна, прысутнічаюць ва ўсіх сусветных рэлігіях, народных і племянных веравызнаннях і г.д. І гэтыя зерні добра збіраюцца разам (пры арыентацыі на сутнасць быцця, яго сэнс і галоўную адзнаку для ўсяго, што расце, дыхае, рухаецца – непарыўнасць) для адзінай найгалоўнай ісціны, якая – ісцінна назаўжды, бо прызначана для рэальнага выратавання чалавецтва… Дарэчы, такога кшталту падыходы ўжо былі ў гісторыі, напрыклад, у экуменізме італьянскага філосафа XV ст. Піка дэла Мірандалы, якога вельмі шанаваў наш асветнік Францішак Скарына. Новая метафізіка – спадчына такога кшталту ідэй. Для яе няма больш важнай задачы, чым знайсці выратаванне для чалавецтва. Трактаты Піка дэла Мірандалы і друкаваныя выданні Скарыны былі даступныя абмежаванаму колу іх чытальнікаў. Інтэрнэт здольны разнесці каштоўнасці экуменізму і новай метафізікі да кожнага, галоўнае – растлумачыць іх сапраўднасць і актуальнасць.

Аўтэнтыка – гэта сапраўднае ў шырокім філасофскім абагульненні, і ў жыцці, і ў мастацтве, і ў культуры наогул. У Беларусі найбольш «паглыбленыя ў аўтэнтыку» даследчыкі напрыканцы XX стагоддзя адчулі і аб’ектыўную неабходнасць «звароту да нематэрыяльных каранёў», і абмежаванасць выключна матэрыялістычнага падыходу да этнакультуры і фальклору. Калі «за дрэвамі (тэхналогіямі вытворчасці артэфактаў, песнямі, танцамі) не бачаць лесу (светапогляду)». Пра гэта неаднаразова пісалі, напрыклад, філосафы Уладзімір Конан і Мікола Крукоўскі, якія мелі шмат сяброў і аднадумцаў у асяродку спецыялістаў па фальклоры. Дзякуючы інтуіцыі і пасіянарным намаганням айчыннай народазнаўчай навуковай супольнасці, беларусы маюць, напрыклад, раскошныя нізкі гратэскна-эпічных антрапалагічных фільмаў Зінаіды Мажэйкі, якая пачынала як этнамузыколаг, і дакументальна-навелістычных фільмаў Рэгіны Гамзовіч, якая пачынала як журналіст. Іх фільмы – перадусім фіксацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны нашага народа. Сінхронна-рэгіянальны кампаратыўны «зрэз» аўтэнтычнага фальклору краіны міленіўму занатаваны ў шматтомным фальклорным зборы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», аўтарскі калектыў якога на чале з вучаніцай Мажэйкі Тамарай Варфаламеевай, філолагам Аленай Боганевай і этнахарэолагам Міколам Козенкам атрымаў за сваю працу спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Гэтыя прыклады – сведчанне таго, што свет змяняецца ў напрамку павагі да метафізічных каштоўнасцяў, і наша краіна рухаецца ў агульным напрамку.

У наш час усё больш людзей адчувае неабходнасць звярнуцца да нечага больш стабільнага, карэнна-аўтаідэнтыфікацыйнага (нават на родавым, біялагічна-відавам, чалавечым стадыяльным даляглядзе), і да нязменна-метафізічнага – да традыцыяналізму і фальклору. Ёсць прыклады, калі культывіраванне народнага і аўтэнтычнага можа быць апірышчам буйнога развіцця эканомікі (напрыклад, японскі вопыт падтрымкі народнай творчасці галіны дробнай пластыкі вывеў Японію па відах прамысловасці, знітаваных з мікраэлектронікай, на першае месца ў свеце). А ці мы – беларусы – вызначаліся ў гэтам напрамку?

Быццам, мы – бясспрэчна за аўтэнтычны фальклор, разумеем, што яго метафізічная, пазачасавая і пазапрасторавая аснова-парадыгма здольная дапамагчы нам аўтаідэнтыфікавацца, захавацца і выжыць у любых умовах. Але бліскучае шалупінне новай тэхнагеннай эпохі, на жаль, часцяком выціскае аўтэнтычнае ў народным жыцці, замяняе арыентацыю на адвечнае нядальнабачным матэрыялізмам, асабліва ў моладзевым асяродку. Таму, калі мае маладыя выпускнікі мэтанакіравана прысвячаюць жыццё ахове аўтэнтычнасці фальклору [1] і рэфлексіі метафізічных асноў рэчаіснасці [5] – я гэтым ганаруся. Усё гэта ставіць перад навукоўцамі-гуманітарыямі задачу сістэмна і асэнсавана адстойваць каштоўнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору, а без апеляцыі да метафізікі ахоўная тэорыя такога кшталту заўсёды будзе «кульгаць». Такім чынам, метафізічны пачатак заўсёды аб’ядноўвае лакальна-мастацтвазнаўчыя, культуралагічныя і антрапалагічныя тэорыі, знітаваныя з уяўленнямі пра гарманізацыю, самазахаванне і развіццё Сусвету і чалавека, і дае напрамак для ўдасканалення Онтаса актуальнага часу.

**Спіс літаратуры:**

1. Асадчая, К. Мара спраўдзілася! / К. Асадчая, П. Кургановіч // Краязнаўчая газета. – 2016. – № 11 (604). – С. 4.
2. Аутентификация [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%90%D1%83%D1%82%D0%B5%D0%BD%D1%82%D0%B8%D1%84%D0%B8%D0%BA%D0%B0%D1%86%D0%B8%D1%8F. – Дата доступу : 07.04.2017.
3. Генон, Р. Очерки о традиции и метафизике / Рене Генон ; пер. с фр. В. Быстрова. – СПб. : Азбука, 2000. – 320 с.
4. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору: вучэб.-метад. дапам. / Энгельс Дарашэвіч; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с.
5. Руцкий Е. Структура эсхатологического мифа / Евгений Руцкий // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) : зб. навук. прац /М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў ; рэдкал.: Языковіч В. Р. (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2016. – С. 97 – 99.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ